*Мая Радзіма—СССР*

# «Люблю цябе, Пятра тварэнне...»



...юный град,
Полнощных стран краса
и диво,
Из тьмы лесов, из топи блат
Вознесся пышно, горделиво...

В гранит оделася Нева;
Мосты повисли над водами;
Темно-зелеными садами
Ее покрылись острова...

Так вялікі рускі паэт А. С. Пушкін пісаў пра Ленінград у сваёй паэме «Медны коннік».

Усе называюць Ленінград «горадам мастоў». І гэта назва поўнасцю апраўдвае сябе. Цяпер у горадзе на Няве — каля 300 мастоў. Рэкі і каналы з іх разнастайнымі мастамі надаюць гораду непаўторную своеасаблівасць. Яшчэ Пётр І любіў называць сваё дзецішча «Паўночнай Венецыяй». Казачна прыгожым горадам на вадзе ўяўляў ён сваю сталіцу ў будучым. Яшчэ ў пачатку XVIII стагоддзя з балота выцякала Глухая рэчка, або, як яе трапна называлі, Крывушы. Хутка пасля заснавання горада гэта тэрыторыя была асушана і ў 1764 г. было пачата будаўніцтва Екацярынінскага канала, які ў цяперашні час носіць назву канал Грыбаедава. Асаблівае зачараванне надае каналу цячэнне ракі Крывушы. І толькі паблізу ад яе вытоку канал праклалі па прамой і злучылі з Мойкай. Абліцаваны гранітнымі набярэжнымі, ён стаў зручнай транспартнай магістраллю. На канале ўзведзены прыгожыя і арыгінальныя масты.

Казанскі мост — адзін з найбольш шырокіх мастоў у Ленінградзе, хаця ў мінулым мост праз Екацярынінскі канал быў нешырокім, значна вужэйшым за Неўскі праспект. Казанскі мост прастаяў каля 40 гадоў. Для каменнага арачнага маста такі тэрмін службы не з'яўляецца працяглым і тым больш гранічным, але ў выніку рэзка змяніўшайся планіровачнай сітуацыі раёна, яго неабходна было перабудаваць.

На Грыбаедаўскім канале ўзведзены два масты: Львіны і Банкаўскі. Іх аўтарам удалося дасягнуць вялікага мастацкага эфекта. Казачныя грыфоны на Банкаўскім мосце, напрыклад, выглядаюць не як статычныя фігуры сімвалічных вартавых, якія ахоўваюць праходы на мост, а як магутныя істоты, што ўтрымліваюць сваімі пашчамі ўсё збудаванне. Гэты мастацкі эфект праяўляецца ў позах грыфаў, у напружанай шыі, у выцягнутых уперад і ўпіраючыхся ў п'едэстал лапах, у распасцёрта-прыўзнятых уверх вялікіх магутных крылах і ў моцнай мускулатуры на нагах і тулаве. Але грыфы не толькі ўпрыгажэнне, унутры іх змешчана канструкцыя з металічных стрыжняў, якія ўтрымліваюць ланцугі.

Другім дэкаратыўным элементам Банкаўскага маста з'яўляюцца чыгунныя літыя агароджы складанага, але вельмі ажурнага малюнка.

Мудрагеліста выгінаецца канал Грыбаедава, парушаючы маналітны рытм прылягаючых кварталаў. Шматлікія спускі «апранутай» у граніт рачулкі Крывушы маляўніча разнастаяць навакольны пейзаж. У яе водах адлюстроўваюцца гранітныя набярэжныя, старыя дамы, масты, мосцікі... У гэтым раёне Ленінграда ўсе вее даўніной. Але для таго, каб у поўнай меры адчуць усю прыгажосць і гармонію Ленінграда, трэба пахадзіць на берагах Нявы, услухацца ў ціхі плёскат яе хваляў, угледзецца ў абрысы будынкаў, мастоў, набярэжных, рэк і каналаў.

Кожны раз, калі мне пашчасціць зноў прыязджаць у горад на Няве, я прыходжу на новую сустрэчу з мастамі Ленінграда. І ў чарговы раз перада мной раскрываецца ва ўсім сваім зачараванні Ленінград — горад дзівосны і непаўторны.

**НА ЗДЫМКАХ: 1. Грыбаедаўскі канал. 2. Банкаўскі мост. 3. Спуск на Грыбаедаўскі канал.**

Тэкст і фота
**А. УЛЬЯНКІНАЙ.**





*СЕМІНАР—НАРАДА*

# МАЛАДЫМ СПЕЦЫЯЛІСТАМ— ТРЫВАЛУЮ ЗАГАРТОЎКУ

Пры падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшага і сярэдняга звяна ў кожнай навучальнай установе вялікую ўвагу абавязаны ўдзяляць фізічнай загартоўцы юнакоў і дзяўчат, ад чаго ў многім будзе залежыць іх прафесіянальная працаздольнасць. Такая думка чырвонай ніткай праходзіла праз усе выступленні ўдзельнікаў семінара-нарады рэктараў, дырэктараў, старшыняў прафкомаў, загадчыкаў кафедр фізічнага выхавання, старшыняў спартклубаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, на якім абмяркоўваліся пытанні фізкультурна-аздараўленчай і спартыўнай работы. Семінар-нарада праходзіла ў нашым універсітэце. Пасля яе ўрачыстага адкрыцця былі заслуханы даклады: загадчыка кафедры фізвыхавання ГДУ кандыдата педагагічных навук В. А. Каляды — аб фізічным выхаванні студэнцкай і навучэнцкай моладзі; намеснікаў старшыні абласнога савета ДФСТ прафсаюзаў Я. В. Фядотава і А. Ц. Барысюка — адпаведна аб стане фізкультурна-масавай і аздараўленчай работы ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах і аб далейшым развіцці спорту і павышэнні майстэрства спартсменаў у ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных установах вобласці.

Загадчык аддзела масавай фізкультурна-аздараўленчай работы сярод навучэнцаў і студэнцкай моладзі аблсавета ДФСТ прафсаюзаў М. П. Хандогін сваё выступленне прысвяціў другому этапу II студэнцкай спартакіяды.

На семінары-нарадзе яго ўдзельнікі абмяняліся вопытам работы, пераможцам абласной круглагадовай спартакіяды ВНУ і тэхнікумаў былі ўручаны ўзнагароды.

Для азнаямлення ўдзельнікі семінара-нарады наведалі стартыўныя збудаванні некаторых навучальных устаноў горада.

У рабоце семінара-нарады прынялі ўдзел член бюро абкома КПБ, старшыня аблсаўпрофа В. Д. Ляскоў, сакратар аблсаўпрофа М. В. Ігнаценка.

# ЭКСКУРСІЯ Ў КІЕЎ

**Для вялікай групы камсамольцаў арганізацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта ў цікавым падарожжы прайшлі мінулыя субота і нядзеля. Па лініі бюро маладзёжнага турызму «Спадарожнік» для іх была арганізавана экскурсія ў сталіцу суседняй братняй рэспублікі — Кіеў. У старажытным горадзе на Дняпры гамяльчане пазнаёміліся з яго славутасцямі.**

**Экскурсія пакінула ў кожнага яе ўдзельніка прыемныя ўражанні.**

май навісла яшчэ больш грозная небяспека — інтэрвенцыя германскіх імперыялістаў. На тэрыторыі Гомельшчыны, як і ў радзе іншых раёнаў Беларусі, завязаліся жорсткія баі. Асабліва ўпарты характар яны прынялі на подступах да Гомеля, пад Горвалем, у раёне Жлобіна, Буда-Кашалёва, Добруша. Аб гераічнай барацьбе з нямецкімі акупантамі сведчаць помнікі і брацкія магілы: у гарадскім парку і непадалёку ад чыгуначнага вакзала ў Рагачове, у Доўску, Побалаве, вёсцы Казіміраўка Жлобінскага раёна, на ўскраіне Добруша.

Як вядома, значная частка Гомельшчыны была акупіравана кайзераўскімі войскамі. Але савецкія людзі не сталі на калені перад акупантамі, узняліся на ўсенародную барацьбу з імі. Летам 1918 года толькі ў Гомельскім павеце пад кіраўніцтвам Палескай арганізацыі бальшавікоў дзейнічала звыш дзесяці партызанскіх атрадаў.

Многія патрыёты загінулі ў гэтай барацьбе. Іх памяці прысвечан рад помнікаў. У 1927 годзе ў вёсцы Карма Добрушскага раёна быў узведзены абеліск (у 1967 годзе адноўлены) на магіле партызан, загінуўшых у 1918 годзе. Падобны ж помнік-абеліск пабудаваны жыхарамі Свяцілавіч на магіле расстраляных нямецкімі акупантамі партызан.

За некалькі дзён да вызвалення Рэчыцы, у пачатку студзеня 1919 года ў час сутыкнення з ворагамі загінуў член падпольнага рэўкома бальшавік В. В. Жыляк. Імем адважнага бальшавіка названа адна з вуліц горада. Яго астанкі ў 1975 годзе былі перапахаваны ў парку Перамогі, на магіле ўстаноўлена мемарыяльная пліта.

Да сярэдзіны студзеня 1919 года Гомельшчына была вызвалена ад нямецкіх акупантаў. Але міжнародны імперыялізм не спыніў сваіх спроб звергнуць Савецкую ўладу. У лютым—сакавіку 1919 года адбылося некалькі антысавецкіх выступленняў на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і на Гомельшчыне. Буйнейшыя з іх — кулацкі мяцеж у Кармянскай воласці, антысавецкае выступленне ў часцях 10-га пагранпалка ў Рагачове і стракапытаўскі мяцеж у Гомелі і Рэчыцы. Гэтыя падзеі адлюстраваны ў радзе помнікаў. У 1923 годзе быў узведзены, а ў 1949 годзе адноўлены помнік-абеліск на брацкай магіле ахвяр бандыцкага мецяжу ў гарадскім пасёлку Карма. У гарадскім парку Рагачова ўстаноўлены абеліск на магіле камісара пагранпалка А. Ф. Цымермана, забітага мяцежнікамі. Яго імя прысвоена гарадскому парку.

31 сакавіка, пасля разгрому стракапытаўцаў, партыйныя, савецкія работнікі і чырвонаармейцы, якія загінулі ў барацьбе з мяцежнікамі, былі пахаваны ў брацкай магіле на Гогалеўскім бульвары (зараз сквер імя Ф. Э. Дзяржынскага). Пасля Вялікай Айчыннай вайны тут узведзен помнік, на ім — імёны камунараў.

Вясной 1919 года пачалася польская інтэрвенцыя, і Гомельшчына зноў стала арэнай ваенных дзеянняў. У сакавіку 1919 года белапалякі захапілі Мазыр, Калінкавічы, Васілевічы. Упартыя баі ішлі пад Рэчыцай. Камуністы і камсамольцы горада дапамагалі воінам 57-й стралковай дывізіі Чырвонай Арміі перапраўіцца на левы бераг Дняпра. На гэтым месцы ў 1930 годзе, у дзесятую гадавіну вызвалення Беларусі ад польскіх інтэрвентаў, быў узведзены абеліск у памяць аб гераічнай барацьбе рэчыцкіх камуністаў і камсамольцаў.

Вялікі ўрон праціўніку каля вёскі Капань нанеслі курсанты Мінскіх камандзірскіх курсаў. На брацкай магіле загінуўшых у гэтым баі курсантаў узведзены помнік-абеліск.

Уся краіна ведае імя легендарнага беларускага партызана дзеда Талаша. Яму ўзведзены помнік у Петрыкаве, на яго магіле ўзвышаецца абеліск.

Аб барацьбе з белапалякамі расказваюць і помнікі г. Мазыра. На высокай гары, у раёне стадыёна, на брацкай магіле, у якой пахаваны камісар 41-й стралковай дывізіі Н. С. Данілеўскі, камуністы Г. Салаўёў, Д. В. Бобр і іншыя, што загінулі ў баях з белапалякамі, узведзены помнік. На доме № 32 па вуліцы Леніна, дзе ў 1920 годзе размяшчаўся штаб брыгады, устаноўлена мемарыяльная дошка ў памяць аб героі-камісары Н. С. Данілеўскім.

Усе гэтыя помнікі рэвалюцыйнай і баявой славы служаць справе выхавання падрастаючых пакаленняў у духу савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, пачуцця дачынення да спраў, слаўных рэвалюцыйных і баявых традыцый нашай партыі і народа.

**Г. ЕЎДАКІМЕНКА,**
**старшыня абласнога навукова-метадычнага савета таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, дацэнт кафедры гісторыі СССР і БССР ГДУ.**

*Вясёлы перапынак*

# З АДКАЗАЎ НА ЭКЗАМЕНЕ

**ПА БІЯЛОГІІ АБІТУРЫЕНТАЎ-87 ЗАВОЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА**

✦ Дарвін рабіў натуральны адбор.

✦ Аскарыда не мае ні рук, ні ног, ні рота.

✦ Да атрада грызуноў адносяцца сабакі, кошкі, львы.

✦ Нярвовая сістэма прадстаўлена скурай.

✦ Чалавек адносіцца да тыпу членістаногіх.

✦ Пашкоджанне мозгу прыводзіць да адмоўных вынікаў.

✦ У ракавіне малюскаў выпрацоўваюцца алмазы.

✦ У кляшча ёсць пазваночнік.

✦ Акула мае форму тарпеды, у яе велізарныя зубы і вочы. Адносіцца да тыпу паўзуноў.

✦ Сэрца чалавека складаецца з дзвюх вялікіх камер.

✦ У водарасцей ёсць органы дыхання.

✦ У павука за вачамі знаходзяцца вушныя ракавіны.

✦ Вірусы — гэта хваробы.

✦ Храмасомы перадаюцца і атрымліваюцца гены.

**(Запісалі члены экзаменацыйнай камісіі).**

*ВЫСТАЎКІ*

# СУСТРЭЧА З ЦУДОЎНЫМ

**У галоўным корпусе універсітэта — выстаўка мастацкай фатаграфіі. Чатыры аўтары, члены фотаклуба «Палессе», вырашылі паказаць студэнтам і супрацоўнікам свае работы. У кожнага свой почырк, свой погляд на свет, і таму выстаўка атрымалася ёмістай і разнастайнай па сюжэтах. Усе чатыры фотамастакі цудоўна дапоўнілі адзін аднаго.**

Самае значнае месца ў экспазіцыі занялі работы Сяргея Коваля, выпускніка геалагічнага факультэта. Яго цікавяць у асноўным будзённыя сюжэтныя сітуацыі — гарадскі пейзаж або жанравыя сцэнкі — тое, чаму мы з'яўляемся сведкамі кожную гадзіну. Але ў нашай звычайнай мітусні нам няма калі спыніцца і ўбачыць прыгажосць наваколля. Ненавязліва і далікатна разважае ён аб прыгажосці быцця, ці то адлюстраванне дрэва ці рачной хвалі, хлопчыкаў, якія гуляюць у двары ў баскетбол, або сабакі, што «зацікавілася» асартыментам кіёска... Дзякуй аўтару за тое, што ён вярнуў нам гэтыя імгненні.

Сяргея вызначае тонкае пачуццё формы, яму больш уласцівы выцягнутыя, вытанчаныя кампазіцыі, што заўсёды цудоўна спалучаюцца з зместам. Хацелася б, каб караблік дзяцінства з фотаздымка Сяргея Коваля суправаджаў яго ўсё жыццё, і кожны позірк на свет, як у дзяцінстве, захаваў навізну і здзіўленне.

Сяргей Халадзілін — фотакарэспандэнт газеты «Гомельская праўда», студэнт-завочнік ГДУ. На выстаўцы ён прадставіў невялікую, але разнастайную па сюжэту калекцыю. Тут і партрэты, і гарадскі пейзаж, і мора: аўтар усёедны.

Вось работа «Трынаццатая вясна»: дзяўчынка весела і задзірыста зірнула, звярнуўшыся, у аб'ектыў. І хаця няма ніякіх атрыбутаў вясны — ні набухлых пупышак, ні вясенніх кветак, у гэтую вясну верыцца. Выклікае ўсмешку партрэт сына аўтара — хлопчык такі маленькі, што ўмясціўся без праблем у татаў дыпламат. Напэўна, там яму больш утульна, чым проста на падлозе.

У Сяргея Халадзіліна цікавая тэхніка, ад якой работы выйграюць. На жаль, бываючы на фотавыстаўках, мы рэдка сустракаемся з тэхнікай растра, рэльефу, што робіць работы незвычайнымі.

Аматары фатаграфіі былі рады новай сустрэчы з работамі мужа і жонкі Віктара і Лары Граматчыкавых пасля іх персанальнай выстаўкі. Тут яны прадставілі пейзажы і партрэты.

Лара — вопытны, патрабавальны да сябе майстар-партрэтыст. Выпадковых работ у яе няма, амаль усе яе партрэты пастановачныя. Яна старанна прадумвае сюжэт, любая дробязь у кадры «працуе» на раскрыццё характару. Яе цікавяць людзі ў момант праяўлення пачуццяў, у адным метры ад аб'ектыва Лары ўдаецца прымусіць партрэтуемага «жыць». І тады «Санта Лючыя» нібы знікае з кадра, ветэран вайны з болем успамінае перажытае, а «Паэт» — поўны годнасці і натхнення.

Віктара больш цікавіць пейзаж. Цяжка паверыць, што «Снегапад» зняты ў цэнтры горада, а пейзаж з возерам — усім знаёмае месца адразу за мастом праз раку Сож, дзе ўсе мы летам загараем. Цяпер аўтара цікавіць экалагічная тэма, а работа «У адзіным страі» — з гэтага цыкла.

**Для многіх наведванне выстаўкі стала першым знаёмствам з вялікай фатаграфіяй, той, што завецца фотамастацтвам. Магчыма, хтосьці і далей стане сачыць за фотавыстаўкамі ў нашым горадзе, зацікавіцца фатаграфіяй сам. Для іх у г. Гомелі працуе народны фотаклуб, які ўзгадаваў аўтараў гэтай экспазіцыі ва універсітэце.**

**Выстаўка стала прыемнай і арыгінальнай падзеяй у культурным жыцці ГДУ.**

**Алена МЕЛЬНІКАВА,**
**студэнтка завочнага факультэта,**
**слухачка народнага фотаклуба «Палессе».**




**НА ЗДЫМКУ: аўтары фотавыстаўкі Л. Назарава, С. Халадзілін, С. Коваль.**

*ГЭТА ЦІКАВА*

# КАМЯНІ ПРЫ ДАРОЗЕ

**Старажытныя людзі верылі ў тое, што ўсё на зямлі можа жыць і размнажацца.** Прычым, не рабілі агаворкі на тое, чалавек гэта быў ці дрэва, зоркі ці звычайныя камяні. У тыя далёкія часы пакланяліся нават камяням, і пры гэтым лічылі, што яны жывыя і могуць расці, аддзяляцца адзін ад другога, перасоўвацца на значныя адлегласці. Іх надзялялі чалавечымі імёнамі, ім прыносілі даніну.

У народных легендах вельмі часта апавядаецца аб цудадзейных камянях. Вось такі вельмі распаўсюджаны варыянт: «У Ашмянскім павеце, за мястэчкам Смаргонь, пры Мінскай паштовай дарозе, на лузе ляжыць камень пяць аршын, шырынёй — чатыры. Далей за Смаргонямі, ёсць камень яшчэ большы за гэты... Ад яго і бліжняе мястэчка завецца Камень... Пра гэты большы камень расказвалі, што нібы ў даўнія часы, калі хто пакладзе на яго два злотых, дык, вярнуўшыся дадому, знаходзіў боты, якія невядома адкуль узяліся».

Здаўна сутыкаючыся з валунамі, селянін прыстасоўваў іх для сваіх гаспадарчых патрэб, нярэдка выкарыстоўваў камяні самай мудрагелістай формы для ўпрыгожвання двара ці проста замуроўваў у падмурак.

Некаторыя камяні захавалі на сабе выбітыя крыжы. Так, у наваколлі вёскі Крэва на Гродзеншчыне вучоныя выявілі пастаўленыя вертыкальна камяні з таямнічымі крыжамі. Паводле старажытнага падання яны павінны былі захаваць насельніцтва ад эпідэміі чумы, якая ўспыхнула ў тых мясцінах ў пачатку мінулага стагоддзя. У другім раёне ёсць цэлы «скульптурны музей» валуноў. У іх, згодна з легендай, быў ператвораны селянін разам з быкамі за тое, што ён удумаў араць у дзень рэлігійнага свята. Да гэтага часу захаваўся нават камень, які нагадвае нешта накшталт язычніцкага капішча. Людзі гавораць, што ў гэтага каменя нашы далёкія продкі прасілі ў сухое надвор'е паслаць на зямлю дождж, таму і называецца ён «Дождж-богавым».

Асаблівую цікавасць уяўляюць валуны, на якіх выразна відаць адбіткі ступні чалавека. Амаль аб кожным з такіх камянёў былі складзены легенды. На Віцебшчыне, дзе іх асабліва многа, адзін з камянёў, з адбіткам нагі, знаходзіўся ля ракі Дзвін Існавала прыгожая легенда, што тут жыла дзяўчына-волат, якая ў адзін крок пераступала ўсю раку. Толькі раз яна спатыкнулася і, нібы шукаючы раўнавагі, наступіла на гэты вялізны валун. Сустракаюцца камяні са слядамі жывёлін. Так, каля Радашковіч вучоныя знайшлі камень з адбіткам следа аленя, а каля вёскі Журавец у Асіповіцкім раёне ёсць валун, на паверхні якога выбіты сляды мядзведзя, зайца, ваўка, лісіцы. Паводле падання, гэты камень ляжыць тут з таго часу, калі ён быў мяккі, і кожны звер, наступаючы на яго, пакідаў свой след, якому наканавана было перажыць стагоддзі. Да таго ж, гэтыя «каменныя сляды» сведчаць пра багаты жывёльны свет Беларусі тых часоў.

Дарэчы, першым звярнуў увагу на камяні-следавікі вядомы старажытны вучоны Герадот (V ст. да н. э.). У сваіх нарысах аб старажытнай Скіфіі, як незвычайную з'яву ён адзначыў «ступню Геракла» у скале на беразе Днястра і падкрэсліў, што мясцовае насельніцтва пакланялася скале і вельмі шанавала след.

Цікава адзначыць і тое, што ў літаратуры часам трапляюцца звесткі аб тым, што ў Беларусі сустракаліся выразаныя на кладках сляды праз рэчку альбо на дошках, раскіданых сярод вуліцы ў вёсках, каб вясной і восенню можна было перабрацца праз лужыны, што разліваліся суцэльным возерам. Даследчыкі выказваюць думку, што гэтыя сляды сведчаць пра панаваўшае сярод беларусаў павер'е, па якому душа чалавека пасля яго смерці некаторы час блукае па свеце, пакуль не знойдзе адведзенае ёй месца, і ў гэты час зрэдку душы памёршых наведваюць жывых, прыходзяць да іх у госці (пад каляды, памінкі і г. д.). Таму людзі і раскідалі дошкі з выразанымі слядамі, каб душы не заблудзіліся ў цемры і не шукалі падоўгу новае жыллё сваякоў.

Часам, асабліва ў апошнія гады, этнографы, фалькларысты імкнуцца растлумачыць гэты факт і тым, што ўсё вышэй сказанае проста адбітак язычніцкага пакланення старажытных беларусаў усемагутнаму богу сонца, які ў любы момант мог наслаць на зямлю засуху і ператварыць усё жывое, рознакаляровае ў аднолькавае — вымершае. А царкоўнікі, каб падкрэсліць кананічнасць багоў і святых, пачалі сцвярджаць, што гэта начамі, калі людзі спяць, прыходзяць на зямлю «пасланцы неба». Яны ходзяць па наваколлі, прыглядаюцца да таго, каб усё ішло па спрадвечных законах, а калі дзе-небудзь заўважалі нейкі непарадак, ці непакорнага селяніна, то тут жа жорстка з ім распраўляліся.

Зрэдку і пісьменнікі звяртаюцца да вобраза-сімвала каменя. У іх творах ён сімвалізуе сабою скварпнасць, маўклівасць, бязлітаснасць. Так, напрыклад, у выдавецтве «Мастацкая літаратура» за 1986 год, выйшаў раман Генрыха Далідовіча «Гаспадар-камень», у якім апавядаецца і пра тое, як у цяжкія часіны жыцця людзі прыходзілі да каменя, каб спытаць у яго парады, параіцца, звярнуцца за дапамогай, але той быў абыякавым да іх гора.

Вось такія цікавыя гісторыі, апавяданні, легенды расказваюць аб звычайных камянях, што даволі часта сустракаюцца на прасторах Беларусі, і на якія мы ўжо амаль не звяртаем асаблівай увагі.

**А. НЕНАДАВЕЦ,**
**кандыдат філалагічных навук,**
**асістэнт кафедры рускай літаратуры**

*З вамі гутарыць урач*

# ЗЛАЧЫННАЯ ЗАЛЕЖНАСЦЬ

Наркаманія — цяга да рэчываў, якія выклікаюць стан эйфарыі. Прыём наркатычных сродкаў прыводзіць да прывыкання да іх. Здольнасць наркотыку «вербаваць» і «занявольваць» адлюстроўвае сутнасць наркаманіі.

Наркатычныя сродкі розныя па свайму саставу і ўздзеянню на арганізм чалавека. Агульным для ўсіх з'яўляецца фінал: чалавек па прычыне змены псіхічнага стану страчвае кантроль над сабой.

Пачатак наркаманіі звязан з эфектам задавальнення, асалоды — станам эйфарыі. Жаданне зноў зведаць такі стан прыводзіць да паўторных прыёмаў наркотыкаў. Але з кожным наступным прыёмам дзеянне папярэдняй дозы аслабляецца і чалавек павялічвае яе. Гэты ўздым пераносласці наркотыкаў можна лічыць пачаткам захворвання наркаманіяй. Знікае абарончая рэакцыя на перадазіроўку.

Стан псіхічнага дыскамфорту з падзеннем жыццёвай актыўнасці і прыгнечаным настроем па-за прыёмам з'яўляецца адной з асноўных прыкмет наркаманіі і абазначаецца тэрмінам «псіхічная залежнасць». Яна ўзнікае нярэдка пасля 1—2 прыёмаў наркотыку і хутка становіцца неабходнай. Яна прымушае хворага пастаянна знаходзіцца ў пошуках новых порцый наркотыку, і гэта становіцца сэнсам усяго яго жыцця. Затым гэтак жа хутка развіваецца фізічная залежнасць — наступная прыкмета наркаманіі. Справа ў тым, што ў працэсе сістэматычнага прыёму наркатычных рэчываў адбываецца перабудова дзейнасці ўсіх органаў і сістэм арганізма. Калі наркотык не паступае ў арганізм або паступае ў зніжанай дозе, узнікаюць цяжкія расстройствы дзейнасці ўнутраных органаў, нярвовай і эндакрыннай сістэм, што пагражае жыццю. Атрымаўшы прэпарат і імкнучыся навярстаць упушчанае, наркаман свядома павялічвае дозу.

Для ўзнікнення наркаманіі бывае дастаткова адведаць «забароненага плода» 1—2 разы з жадання расслабіцца, забыцца ад непрыемнасцей або нават з простай цікаўнасці пры падбухторванні «паслужлівых» людзей.

У наркалагічных аддзяленнях бальніц наркаманы выклікаюць жудаснае ўражанне. 15—17-гадовыя выглядаюць старымі з ацёчнымі і шэрымі тварамі, без зубоў і валасоў. Яны вельмі худыя, а ад пастаянных ін'екцый у іх з'яўляюцца незажываючыя язвы. У маладых назіраюцца хваробы людзей сталага ўзросту: сардэчная і лёгачная недастатковасць, артрыты і інш. Частыя сярод наркаманаў і венерычныя захворванні.

Як правіла, у наркамана нарастае маральна-этычная дэградацыя асобы.

У апошні час пачасціліся выпадкі таксікаманіі — захворвання, выкліканага хімічнымі, біялагічнымі, расліннымі, лекавымі рэчывамі, якія прыводзяць да прывыкання. Гэта разнавіднасць наркаманіі. Самае страшнае тое, што яна распаўсюджваецца, галоўным чынам, сярод моладзі і падлеткаў. Прывыканне да таксічных сродкаў адбываецца вельмі хутка, ў 10—15 разоў хутчэй, чым да алкаголю.

Адкуль жа ўзяліся ў нашым грамадстве наркаманы і таксікаманы? Прычын тут некалькі. А галоўная з іх — гультайства, нежаданне і няўменне заняць свае рукі і розум карыснай справай. Адсюль пераход яшчэ да большага гультайства — поўнага адключэння ад дзеяння, да «балдзення», да ўзвядзення гэтага стану ў культ.

Большасць наркаманаў і таксікаманаў сярод падлеткаў — дзеці з няшчаслівых сем'яў, дзе бацькі злоўжываюць алкаголем.

Жаданне стаць здаровым — палавіна выздараўлення. Так лічылі старажытныя людзі. Але гэта ісціна застаецца актуальнай і сёння.

**Е. ПІНЧУК,**
**урач паліклінікі № 6,**
**член Таварыства Чырвонага Крыжа.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 3-11, тэл. 57-16-52.

«Гомельскі універсітэт» — орган парткома, рэктарата, профсоюзных комитетов, комитета ЛКСМБ Гомельского государственного университета. Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1.

АЗ 44405
Аб'ём — 1 друк. арк.
Тыраж 2000 экз. Заказ 394.